**В. М. Герасімаў,** *загадчык аддзела старадрукаў і рэдкіх выданняў, Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь*

# КНІГА І КНІЖНІЦЫ БЕЛАРУСІ: АСАБІСТЫ «ГАМБУРГСКІ РАХУНАК»

У кожнага з нас свой ідэал бібліятэкі, сваё бачанне сэнсу існаваннння бібліятэк і бібліятэкараў, паколькі кожны чалавек як Божае стварэнне ўнікальны, і паколькі кожная кніга як квінтэсэнцыя ведаў унікальная. З улікам гэтых пазіцый і пабудавана маё выступленне, своеасаблівы «гамбургскі рахунак», альбо спроба акрэсліць «сапраўдную сістэму каштоўнасцяў бібліясферы» Валерыя Герасімава, бібліятэкара-бібліёграфа 1976 года выпуску Мінскага інстытута культуры; бібліятэкара, які 38 гадоў аддаў працы ў Прэзідэнцкай (раней – Урадавай) бібліятэцы Рэспублікі Беларусь і сёння кіруе аддзелам старадрукаў і рэдкіх выданняў.

Мае асноўныя развагі заключаюцца ў канстатацыі наступнага: унікальная кніжна-культурная спадчына беларускага народа з’яўляецца не толькі нацыянальным гонарам, але і важным чыннікам сусветнай цывілізацыі. Мы маем старажытныя карані пісьменства і ўласнай рукапіснай кнігі. (Згодна з апошнімі дадзенымі этналінгвістыкі беларусы могуць прэтэндаваць нават на культурную спадчыну ведаў і пісьменства старажытных арыйцаў, інакш – індаіранскага этнасу). Менавіта праз нас ішла цывілізацыйная місія друкарскага станка з Захаду на Усход. І менавіта з Захаду і Усходу мы спарадычна зведвалі навалы прыніжэння і знішчэння нашага матчынага Слова. Мы маем залатое XVI ст. сваёй кніжнай культуры і бездань заняпаду XVIII і XIX стст. Мы маем узлёты і падзенні беларускай кнігі ў XX–XXI стст.

І, нарэшце, сучасны этап: за два дзесяцігоддзі нацыянальнага адраджэння канца XX – пач. XXI ст. і існавання незалежнай Рэспублікі Беларусь у бібліятэчнай справе і айчынным кнігазнаўстве зроблена столькі, колькі, магчыма, за некалькі стагоддзяў да таго. Таму вылучу асобна толькі асноўныя праблемы, пераважна ў галіне кніжнай справы, але ў сувязі з агульнай арганіза-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цыяй працы бібліятэк. Умоўна кажучы, гэта пытанні, звязаныя з установамі, формамі працы, кадрамі, ментальнасцю (ідэалогіяй).

*Першае.* Бібліятэкі і дзяржава. Пасля «пераезду» ў новы будынак Нацыянальная бібліятэка Беларусі (НББ) зрабіла значны крок наперад у сваім развіцці, параўнальна з іншымі бібліятэкамі рэспубліканскага статусу: «акадэмічнай», «прэзідэнцкай», РНТБ і да т. п. Але пры ўсіх дасягненнях НББ, падаецца, у сучасных умовах не можа (ды гэта, відаць, і не трэба) стаць супербібліятэчнай установай кшталту Бібліятэкі Кангрэсу ЗША. А вось пэўнае падзенне прэстыжу, паніжэнне іх статусу і нават знікненне некаторых рэспубліканскіх бібліятэк мы сёння назіраем. Думаецца, выклікана гэта, акрамя ўсяго, і некаторым зніжэннем да іх грамадскай увагі, і не вельмі дакладным разуменнем іх задач з боку дзяржаўных структур.

Дрэнна, што шэраг праектаў дзяржаўных праграм па захаванні гістарычнай дакументальнай спадчыны Беларусі, уключаючы праекты рэстытуцыі і дзяржаўнага рэестру кніжных помнікаў, распрацаваных энтузіястамі кніжнай справы (адзначу асабісты ўклад загадчыкаў аддзела рэдкай кнігі НББ Таццяны Рошчынай і Галіны Кірэевай) пад кіраўніцтвам НББ яшчэ ў 1990–2000-я гг. па волі чыноўнікаў паступова сыходзяць у нябыт.

*Другое.* Стварэнне рэспубліканскага навукова-даследчага і навукова-практычнага цэнтру (інстытута) ў галіне кнігазнаўства і кніжнай справы. Першапачаткова такі цэнтр можа існаваць на базе бібліятэкі і кафедр адпаведнага профілю БДУКіМ. Тут дарэчы будзе ўнікальны вопыт працы былога калектыву аддзела рэдкай кнігі БДУКіМ Тамары Самайлюк, Ларысы Доўнар і Таццяны Дзем’яновіч пры арганізацыі шматгадовых Кірыла-Мяфодзіеўскіх чытанняў і рэалізацыі шэрагу іншых кнігазнаўчых праектаў, якія пераважна мелі міжнародны характар. Гэта ні ў якім разе не павінна і не можа супярэчыць каардынацыйным і навукова-метадычным функцыям у галіне працы з рэдкай кнігай навукова-даследчага аддзела кнігазнаўства НББ. Рацыянальнае размежаванне і каардынацыя тут могуць быць па лініі тэорыі і практыкі, навуковых даследаванняў і метадычнай дапамогі.

*Трэцяе.* Рэгіяналы. Колькі ж было раней кніжніц і кнігазбораў у Беларусі! І сёння, калі ў раённай бібліятэцы сцвярджаюць, што ў іх няма ніводнага выдання да 1917 г., атрымліваецца сітуацыя, якую можна зразумець, але не апраўдаць. Лозунг і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

арыенцір тут адзін: 118 раёнаў – 118 падраздзяленняў па працы з рэдкай кнігай. Адмыслова аформленая палічка з рэдкімі кнігамі, часопісамі, газетамі. Асобна выдзелены фонд рэдкіх выданняў. Сектар, аддзел рэдкай кнігі. І пошук, пошук, пошук рарытэтаў, рэгіянальных кніжных помнікаў.

*Чацвёртае.* Крокам назад можна лічыць рэарганізацыю аддзелаў рэдкай кнігі ў сектары пры самых розных іншых бібліятэчных падраздзяленнях (тлумачыцца гэта аптымізацыяй структуры). Але тут немагчыма не пакрыўдзіцца за такія дамарослыя падыходы да кніжных помнікаў. У заходніх універсітэтах бібліятэкі забяспечваюць навучальны працэс крыніцамі, што «сягаюць» у глыб стагоддзяў. Старадрукі і рэдкія выданні – «святое святых»: яны – гонар любой універсітэцкай бібліятэкі, а спалучэнне з электроннымі бібліятэкамі (інфарматэкамі) гэта не выключае.

*Пятае.* Колькасць існуючых музеяў кнігі (беларускага кнігадруку ў Полацку, у складзе навукова-даследчага аддзела кнігазнаўства НББ, пры абласных бібліятэках Гомеля і Магілёва), бясспрэчна, неабходна павялічваць. Актуальнае таксама стварэнне музеяў гісторыі бібліятэк, архіваў пры бібліятэках. Гэта асабліва важна для сталічных бібліятэк. Бо, як вядома, падчас Вялікай Айчыннай вайны бібліятэкі з Мінска не эвакуіраваліся, усё засталося ворагу. І, такім чынам, сёння мы не ў стане высветліць тыя ці іншыя фактаграфічныя дадзеныя з гісторыі асобных бібліятэк.

*Шостае.* Патрэбна шырэй выкарыстоўваць інавацыйныя, перспектыўныя напрамкі працы, сусветны досвед. Дарэчы, дзякуючы Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі (ББА) і яе міжнароднаму камітэту, мы маем магчымасць ужо колькі гадоў шматлікімі дэлегацыямі бібліятэкараў усёй Беларусі наведваць з прафесійна-пазнавальнымі візітамі замежныя бібліятэкі. Упэўнены, той, хто на ўласныя вочы пабачыў Беларускую бібліятэку і музей імя Ф. Скарыны ў Лондане, ваяводскую бібліятэку ў Гданьску альбо Баварскую дзяржаўную бібліятэку раней ці пазней выкарыстае іх вопыт ва ўласнай прафесійнай дзейнасці.

*Сёмае.* Набыццё букіністычнай, антыкварнай літаратуры, якое цесна звязана з праблемай фінансавання, грантаў. Шмат каштоўных выданняў трапляе за мяжу, яшчэ больш рарытэтаў нацыянальнага дакумента і частак беларускіх гістарычных кнігазбораў не могуць адтуль вярнуцца толькі таму, што ў бібліяя-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэкараў Беларусі не хапае фінансавых сродкаў. Чыннікамі тут нам бачацца: дзяржава, спонсары-бізнесоўцы, міжнародныя фонды ў спалучэнні з ініцыятывай саміх бібліятэкараў.

*Восьмае.* Роля дырэктарата, асобы ў бібліятэцы. Беларусі, можна сказаць, пашанцавала: яшчэ ў савецкія часы наш дырэктарскі корпус вызначаўся добрым веданнем спраў, прафесіяналізмам. У незалежніцкі перыяд з'явіліся новыя харызматычныя лідары, «капітаны бібліятэчных караблёў беларускага кніжнага мора-акіяна». Яны выдатна валодаюць новымі тэхналогіямі, камп'ютарнымі праграмамі і рэсурсамі інтэрнету, але, на жаль, не заўсёды разумеюць нюансы нацыянальнай пабудовы бібліятэчнай справы краіны ў вызначэнні ролі рэдкай кнігі ў гэтым, хвараюць на месніцтва і чыста адміністрацыйныя метады кіравання.

Кур'ёзным выглядае выпадак, калі ў адной буйной бібліятэцы доўгі час дзейнічалі загады: «больш трох не збірацца» (супрацоўнікам забаранялася кантактаваць між сабою ў калідорах, заходзіць у іншыя аддзелы) і «не выдаваць тайны ворагу» (забаранялася «выдаваць» калегам з іншых бібліятэк асаблівасці тэхналагічных працэсаў, нюансы жыццядзейнасці калектыву).

*Дзявятае.* Гісторыя кніжнай справы, мемарыя. Апошнім часам выйшлі выдатныя манаграфічныя матэрыялы па гісторыі кнігі і бібліятэк Беларусі за аўтарствам Міколы Нікалаева (нашага земляка, загадчыка аддзела рэдкай кнігі Расійскай нацыянальнай бібліятэкі ў Санкт-Пецярбургу), Рамана Матульскага, Ларысы Доўнар, Юрася Лаўрыка і іншых даследчыкаў. Вельмі актуальныя персаніфікацыя і мемарыялізацыя бібліятэчнай справы, пра якія слушна заўважае Л. Доўнар. Неабходна скласці біяграфічны і біябібліяграфічны даведнікі, выданні энцыклапедычнага характару, прысвечаныя выбітным асобам кніжнай і бібліятэчнай справы Беларусі, спецыялістаў у сумежных архіўнай, музейнай, выдавецка-рэдакцыйнай дзейнасці, кнігагандлі. Князь Ізяслаў, Лелявель, браты Луцкевічы, Ластоўскі, Улашчык, Бібіла, Ватацы і сотні іншых знатных асоб кніжнікаў вартыя таго. Заслугоўваюць яны і на мемарыяльнае ўвасабленне – барэльефы, шыльды, помнікі, напрыклад, каля ўваходу ў БДУКМ. Уяўляецца мне і помнік, прысвечаны абагульненаму вобразу бібліятэкара як захавальніку кніжных скарбаў у гістарычнай рэтраспектыве.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дзясятае.* Нацыянальная культура. Часам не хапае ў нас пачуцця нацыянальнай годнасці ў адносінах да канкрэтных спраў. Да прыкладу, толькі НББ падтрымлівае паўнацэнны беларускамоўны варыянт свайго інтэрнэт-парталу і беларускую мову каталагізацыі ў праграмным забеспячэнні. Зрэшты, дапамагчы тут можа адзіны зводны каталог кніжных фондаў бібліятэк краіны з адзінымі моўнымі стандартамі яго вядзення і падтрымкі. А таксама адзіная сетка чытацкага карыстання бібліятэкамі напрыклад, так, як у Літве: запісаўся ў вясковую бібліятэку і… адначасова стаў карыстальнікам усёй бібліятэчнай сеткі краіны.

Важны і такі аспект нацыянальнай культуры, як дата заснавання кніжніц. З нашымі старажытнымі каранямі і кніжнымі традыцыямі сорамна весці свае радаводы толькі пасля 1917 года. Хай сабе віртуальна, але прэстыжна было б НББ лічыць сябе «нашчадкам» бібліятэкі Сафійскага сабора ў Полацку, Прэзідэнцкай бібліятэцы – вялікакняскіх кніжніц ВКЛ, ЦНБ НАНБ – бібліятэкі Полацкай акадэміі. Так, Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка адзначае ў лістападзе сваё стагоддзе (ад 1914 г.), а бібліятэка пры ім маўчыць. Альбо Магілёўскі бібліятэчны каледж, заснаваны пастановай СНК у 1946 г., вядома ж, можа быць умоўным спадчыннікам Магілёўскага тэхнікума палітасветы, які быў адкрыты ў 1928 г. і рыхтаваў спецыялістаў для хат-чытальняў, нардамоў, клубаў і бібліятэк.

Менавіта бібліятэкі маглі б сёння стаць і пляцоўкай яднання нацыянальнай інтэлігенцыі ў сучасных складаных умовах нацыянальна-культурнага будаўніцтва ў Беларусі і геапалітычных інфармацыйных войнаў. Задача бібліятэкара – даць рознабаковую інфармацыю. А вы, прафесійныя гісторыкі і правазнаўцы, дыскутуйце потым, высвятляйце гістарычную ісціну.

Думаецца, неабходна было б тут бібліятэкам супрацоўніцтва з абодвума саюзамі пісьменнікаў Рэспублікі Беларусь і арганізацыямі культуры, кшталту, згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына» ці грамадская ініцыятыва «Будзьма беларусамі!». Гэта патрэбна для ўзмацнення сацыякультурнай ролі канкрэтнай бібліятэкі, папулярызацыі яе фондаў. Да ўсяго, гэта каштоўны і даволі эксклюзіўны канал набыцця беларусазнаўчай літаратуры, якая не трапляе пад абавязковую рассылку выдавецтвамі, або выйшла за межамі Беларусі.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Прэстыжна, калі бібліятэкары ўваходзяць у склад журы літаратурных конкурсаў. Прэстыжна, калі сярод выпускнікоў БДУКіМ значыцца «жывы класік» беларускай літаратуры Андрэй Федарэнка і таленавітыя аўтары, якія, на жаль, пайшлі з жыцця Георгій Сысой і Алесь Шаўцоў.

Якімі бачацца перспектывы? Амерыкі не адкрыем, з нашага пункту гледжання, галоўная мэта, місія, калі хочаце, філасофія, бібліятэчнай і кніжнай справы Беларусі ў XXI ст. – узняць яе на ўзровень, які б годна адпавядаў незалежнаму і суверэннаму статусу нашай дзяржавы, які базаваўся б на гістарычных каранях беларускай кнігі і кніжніц – на нацыянальнай культуры, роднай мове, павазе да звыштысячагадовай гісторыі нашай дзяржаўнасці і нацыянальных гістарычных сімвалаў, які садзейнічаў бы высокай сацыяльнай прэстыжнасці бібліятэчнай прафесіі. Чым адрозніваецца беларускі бібліятэкар ад, скажам, французскага, нямецкага ці кітайскага? Тым, што хоць частачку сваёй жыццядзейнасці ён павінен ахвяраваць на нацыянальнае адраджэнне, якое ў нас яшчэ не скончана.

**Г. М. Друк,** *дацэнт кафедры беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры, кандыдат філалагічных навук, дацэнт, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў*

## КНІГА Ў СІСТЭМЕ МАСТАЦКА-ФІЛАСОФСКІХ РАЗВАГ У. КАРАТКЕВІЧА

Пытанні пра ўплыў кнігі на чалавека і сутнасць гэтага ўплыву не перастаюць прыцягваць увагу пісьменнікаў і навукоўцаў. У час інтэнсіўнага развіцця камп'ютарных тэхналогій, якія спрыяюць з'яўленню чытача, пераважна як спажыўца інфармацыі, гаворка пра кнігу і мастацкую літаратуру, што дае працу адначасова і душы, і розуму, становіцца асабліва актуальнай.

Класікі беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя ўслед за Е. Полацкай і К. Тураўскім, Ф. Скарынам, Ф. Багушэвічам і іншымі лічылі размову з чытачом пра высокую асвету адной з першачарговых задач, усведамляючы каштоўнасць літаратурнай адукацыі, з якой звязвалі магчымасць чалавека і грамадства быць шчаслівым. Калі народ «“цёмны, як той скот”, ён “бяды



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ